Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# Уперад

№ 16 (251) панядзелак 19 сакавіка 1945 г.

Орган Лідскага Г.К. і Р.К. КП (б) Беларусі, Гарадскога і Раённага Совета Дэпутатаў Працоўных.

Цана 15 кап.

**Войскі 1-га БЕЛАРУСКАГА фронта, зламаўшы супраціўленне акружанага гарнізона немцаў, 18 сакавіка авалодалі горадам і портам на Балтыйскім моры КОЛЬБЕРГ.**

**Слава нашай гераічнай Чырвонай Арміі!**

## За далейшы ўздым сельскай гаспадаркі

Совет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі вынеслі пастанову аб дзяржаўным плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год. „Совет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б, — гаворыцца ў пастанове, — лічаць галоўнай задачай калгасаў, машынна-трактарных станцый, соўгасаў, зямельных органаў, партыйных і совецкіх арганізацый у галіне сельскай гаспадаркі хутчэйшае аднаўленне і далейшае развіццё сельскай гаспадаркі рэспублікі з тым, каб у бліжэйшыя 2—3 годы забяспечыць аднаўленне даваенных размераў пасеўных плошчаў, павышэнне ўраджайнасці і павелічэнне валавога збору збожжа, бульбы і іншых сельскагаспадорчых прадуктаў".

Задачы, якія пастаўлены партыяй і ўрадам перад сельскай гаспадаркай рэспублікі на 1945 год, выключна вялікія і адказныя. Пастанова партыі і ўрада—гэта баявая праграма аднаўлення і далейшага развіцця нашых калгасаў, соўгасаў і МТС. Каб паспяхова ажыццявіць гэтую праграму, ад совецкіх і партыйных арганізацый, зямельных органаў, калгасаў, МТС і соўгасаў патрабуецца сканцэнтраванне намаганняў на паспяховае вырашэнне намечаных мерапрыемстваў.

Прайшло ўсяго 8 месяцаў з таго часу, як доблесная Чырвоная Армія вызваліла Беларусь з фашысцкай няволі. За гэты параўнальна кароткі час праароблена значная работа па аднаўленню разбуранай ворагам сельскай гаспадаркі. Не гледзячы на вялікі недахват рабочых рук, цягла, машын, перамагаючы цяжкасці ваеннага часу, калгасы, соўгасы, МТС і сяляне-аднаасобнікі арганізавана правялі ўборку ўраджаю ў мінулым годзе, своечасова выканалі абавязацельствы перад дзяржавай і паспяхова правялі сяўбу азімых культур.

Поспехі працаўнікоў палёў тлумачацца перш за ўсё іх небывала вялікай палітычнай і працоўнай актыўнасцю. Радасць вызвалення, гарачае жаданне ўсямерна дапамагчы гераічнай Чырвонай Арміі хутчэй дабіць фашысцкага звера ў яго логаве натхняюць калгаснікаў, рабочых і служачых МТС і соўгасаў, сялян-аднаасобнікаў на новыя працоўныя подвігі.

Наша рэспубліка знаходзіцца напярэдадні веснавой сяўбы. Ад ступені падрыхтаванасці да яе будзе залежыць поспех палявых работ, заваяванне высокага ўраджаю. Вось чаму важна цяпер як мага лепш выкарыстаць дні, якія асталіся да выхаду ў поле, каб падрыхтаваць вясне бальшэвіцкую сустрэчу.

Соўнарком БССР і ЦК КП(б)Б. наметзілі цэлы рад мерапрыемстваў па аднаўленню і развіццю сельскай гаспадаркі заходніх абласцей рэспублікі. Партыйныя, совецкія і зямельныя органы гэтых абласцей і раёнаў павінны хутчэй ліквідаваць марудлівасць у вырашэнні важнейшага гаспадарчага і палітычнага пытання ў сельскай гаспадарцы заходніх абласцей—надзялення зямлёй у натуры беззямельных і малазямельных сялян. Для аказання дапамогі бясконным гаспадаркам па хутчэйшаму правядзенню імі веснавой сяўбы і ўсіх сельскагаспадарчых работ, пастановай намечана аднаўленне ва ўсіх раёнах МТС, машынна-конных пракатных пунктаў, арганізацыя ўзаемадапамогі ў апрацоўцы і абсемяненні зямель і г. д.

Рыхтуючыся да веснавой сяўбы, патрэбна ў самы кароткі тэрмін давесці да кожнай сялянскай гаспадаркі план пасева, пашыраючы ў нашым раёне плошчу пасева ільну, бульбы і лубіну.

Выкананне плана аднаўлення і далейшага развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі на 1945 год з'яўляецца важнейшай ваенна-гаспадарчай задачай совецкіх і партыйных арганізацый, зямельных органаў, калгасаў, МТС і соўгасаў, камуністаў і комсамольцаў, аграномаў, калгаснікаў і калгасніц, сялян заходніх абласцей, рабочых і служачых.

Па-баявому-ж арганізуем барацьбу за лепшую падрыхтоўку да сяўбы, узорнае правядзенне ўсіх сельскагаспадарчых работ. Дапаможам Чырвонай Арміі хутчэй дабіць фашысцкага звера ў яго логаве, забяспечым чырвоных воінаў і насельніцтва прадуктамі харчавання, а прамысловасць—сыравінай.

## АД СОВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

### Аператыўная зводка за 16 сакавіка

На працягу 16 сакавіка на паўднёвым-захадзе ад Кенігсберга нашы войскі, прадаўжаючы наступленне, занялі населеныя пункты Покарбен, Тэнген, Шойшэн, Весдэлен, Кранцберг, Штобекен, Фуксберг, Ярфталь, Фройдэнталь, Лаўтэрбах, Фрэнзельсвальдэ, Герцогсвальдэ. За 15 сакавіка ў гэтым раёне ўзята ў палон больш 600 нямецкіх салдат і афіцэраў.

На захадзе і на паўночным захадзе ад Данцыга нашы войскі, у выніку наступальных баёў, занялі населеныя пункты Жукава (Цукаў), Пемцаў, Банін, Рамкаў, Эспенкруг. За 15 сакавіка ў гэтым раёне нашы войскі ўзялі ў палон больш 700 нямецкіх салдат і афіцэраў.

На Штэцінскім напрамку нашы войскі вялі баі па ліквідацыі плацдарма немцаў на ўсходнім беразе Одэра, заняўшы пры гэтым горад Грайфенхаген і населеныя пункты Розенгартэн, Брункен, Ной Брункен, Вінтэрсфельдэ.

У Венгрыі, на паўночным усходзе ад возера Балатон, атакі танкавых часцей немцаў, якія панеслі ў папярэдніх баях вялікія страты, значна аслабелі.

На іншых участках фронта баі мясцовага значэння і пошукі разведчыкаў.

За 15 сакавіка на ўсіх франтах падбіты і знішчаны 63 нямецкіх танкі і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 33 самалёты праціўніка.

* * *

### Налёт нашай авіяцыі на чыгуначны вузел Веспрэм у Венгрыі

У ноч на 16 сакавіка нашы цяжкія бамбардыроўшчыкі зноў нанеслі ўдар па чыгуначнаму вузлу Веспрэм у Венгрыі. У выніку бамбардыроўкі на чыгуначным вузле ўзніклі пажары, якія суправаджаліся выбухамі.

* * *

На паўднёвым захадзе ад Кенігсберга нашы войскі прадаўжалі сціскаць кальцо акружэння Усходня-Прускай групы войск праціўніка. Немцы, заціснутыя на вузкай прыбярэжнай паласе, аказваюць адчайнае супраціўленне. Асабліва жорсткія баі адбываліся на захадзе ад населенага пункта Бладзіаў, занятым учора нашымі войскамі. Бладзіаў—вузел шасейных дарог. Авалодаўшы ім, совецкія часці перарэзалі апошнюю, знаходзіўшуюся ў руках немцаў, шасейную магістраль, якая ідзе ўздоўж лініі фронта. Праціўнік спрабаваў аднавіць становішча і прадпрыняў рад атак, але поспеху не дабіўся. Совецкія часці адбілі варожыя атакі і, прасунуўшыся ўперад, захапілі выгадныя пазіцыі. Другія нашы часці перапраўіліся праз раку Лаўтэр і імклівай атакай занялі апорны пункт абароны немцаў Фройдэнталь. У баях за дзень праціўнік страціў толькі забітымі звыш 4000 салдат і афіцэраў. Захоплена ў немцаў 6 танкаў, 50 гармат, 33 мінамёты і 128 кулямётаў.

* * *

На захадзе і на паўночным захадзе ад Данцыга нашы войскі вялі баі на знешнім абараняльным абводзе Данцыгска-Гдынскага ўмацаванага раёна, які складаецца з глыбокага супроцьтанкавага рова, некалькіх ліній траншэй і вялікай колькасці дотаў і дзотаў. На вузкім участку немцы сканцэнтравалі шмат артылерыйскіх і мінамётных батарэй. Усе абаронныя збудаванні прыкрыты густой сеткай дротавых загарож і міннымі палямі. Асабліва ўмацаваны населеныя пункты, якія прыкрываюць дарогі да Данцыга і Гдыні. Совецкія часці, з баямі прасоўваючыся ўперад, выйшлі на паўднёвыя, заходнія і паўночныя ўскраіны населенага пункта Жукава (Цукаў). Буйны гарнізон праціўніка засеў у дотах каменных будынкаў і моцным агнём спрабаваў перагарадзіць шлях нашым часцям. Совецкія пехацінцы і артылерысты падавілі ачагі варожага супраціўлення і авалодалі Жукава (Цукаў). На другім участку нашы войскі адбілі некалькі контратак пяхоты і танкаў праціўніка, падтрыманых агнём артылерыі ваенных караблёў. Перад нашымі пазіцыямі засталіся соткі варожых трупаў. Захоплены трафеі, у ліку якіх 5 танкаў, 7 паравозаў, 120 вагонаў і 5 складаў з ваеннай маёмасцю.

* * *

На Штэцінскім напрамку нашы войскі вялі баі па ліквідацыі плацдарма праціўніка на ўсходнім беразе Одэра. Немцы, імкнучыся любой цаной утрымаць плацдарм у сваіх руках, сканцэнтравалі тут буйныя сілы танкаў, артылерыі і пяхоты. Абапіраючыся на загадзя падрыхтаваныя ўмацаванні, праціўнік аказвае ўпорнае супраціўленне. Пасля жорсткіх баёў совецкія часці, якія прасоўваюцца ўздоўж Одэра на поўнач, з трох бакоў, выйшлі да горада Грайфенхаген. Гарнізон праціўніка быў прыціснут да ракі і разгромлен. Авалодаўшы горадам Грайфенхаген-важным апорным пунктам абароны немцаў на ўсходнім беразе Одэра, нашы байцы захапілі шмат зброі і ваенных матэрыялаў. На другім участку нашы войскі занялі паселішча Розенгартэн і скрыжаванне шасейных дарог у 3-х кілометрах на паўднёвым усходзе ад горада Альтдам. Узята ў палон больш 500 немцаў.

* * *

За апошні час паступаюць паведамленні аб росце дэзертырства ў нямецкай арміі. Салдаты разгромленых нямецкіх часцей і падраздзяленняў паасобку і дробнымі групамі ідуць у тыл, бадзяюцца па лясах, пераапранаюцца ў грамадзянскую вопратку і хаваюцца па населеных пунктах. Ня-

Аканчанне на 2-й стр.

